УСТАНОВА АДУКАЦЫІ
«БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ПЕДАГАГІЧНЫ УНІВЕРСІТЭТ
ІМЯ МАКСІМА ТАНКА»

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Прарэктар па вучэбнай
рабоце БДПУ
______________________ С.І. Васілец
«15» 12 2020 г.

Рэгістрацыйны № ВД-25-101-2020/43/вуч.

# ФІЗІЧНАЯ, ЭКАНАМІЧНАЯ І САЦЫЯЛЬНАЯ ГЕАГРАФІЯ БЕЛАРУСІ

Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне
для спецыяльнасці:
1-02 04 02 Біялогія і геаграфія

2020 г.

Вучэбная праграма складзена на аснове адукацыйнага стандарта вышэйшай адукацыі АСВА 1 - 02 04 02 – 2013, рэгістрацыйны № 88 ад 30.08.2013, вучэбнага плана ўстановы вышейшай адукацыі па спецыяльнасці 1-02 04 02 Біялогія і геаграфія

**СКЛАДАЛЬНІКІ:**

А.Н. Вітчанка, прафесар кафедры геаграфіі і методыкі выкладання геаграфіі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка», доктар геаграфічных навук, прафесар;
В.Л. Андрэева, дацэнт кафедры геаграфіі і методыкі выкладання геаграфіі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка», кандыдат сельскагаспадарчых навук, дацэнт;
Н.Л. Барысава, старшы выкладчык кафедры геаграфіі і методыкі выкладання геаграфіі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка»

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**

Кафедра эканамічнай і сацыяльнай геаграфіі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта;
І.А. Целеш, дацэнт кафедры інжынернай псіхалогіі і эрганомікі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыеэлектронікі», кандыдат геаграфічных навук, дацэнт

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

Кафедрай геаграфіі і методыкі выкладання геаграфіі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка»
(пратакол № 2 ад 1 кастрычніка 2020 г.);
Загадчык кафедры Г.В. Таранчук

Навукова-метадычным саветам установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка»
(пратакол № 3 ад 15.12. 2020 г.)

Афармленне вучэбнай праграмы і матэрыялаў, якія яе суправаджаюць, адпавядаюць дзеючым патрабаванням Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.

Метадыст вучэбна-метадычнага
ўпраўлення БДПУ
______________ А.А. Краўчанка
Дырэктар бібліятэкі
______________ Н.П. Сяткоўская

## ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная праграма па вучэбнай дысцыпліне «Фізічная, эканамічная і сацыяльная геаграфія Беларусі» распрацавана для ўстаноў вышэйшай адукацыі Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з патрабаваннямі адукацыйнага стандарта вышэйшай адукацыі першай ступені па спецыяльнасці 1-02 04 02 Біялогія і геаграфія.

Тэарэтычныя пытанні, якія разглядаюцца ў працэсе вывучэння вучэбнай дысцыпліны, дазваляюць студэнтам авалодаць комплексным геаграфічным падыходам да вывучэння прыроды і грамадства сваёй краіны. Гэтая дысцыпліна садзейнічае паглыбленню фарміравання ў студэнтаў геаграфічнага светапогляду і мышлення.

**Мэтаю** вывучэння вучэбнай дысцыпліны «Фізічная, эканамічная і сацыяльная геаграфія Беларусі» з'яўляецца набыццё студэнтамі разнабаковых ведаў аб прыродзе, насельніцтве і гаспадарцы Беларусі, асаблівасцях іх размяшчэння і тэрытарыяльнага ўпарадкавання.

Да асноўных **задач** вучэбнай дысцыпліны «Фізічная, эканамічная і сацыяльная геаграфія Беларусі» адносіцца вывучэнне:

- асаблівасцяў размяшчэння асобных кампанентаў прыроды ў межах тэрыторыі Беларусі;
- прасторавай структуры сучасных прыродна-антрапагенавых ландшафтаў Беларусі;
- характэрных рысаў сучаснага эканоміка-геаграфічнага і геапалітычнага становішча краіны;
- прыродна-рэсурснага, сацыяльна-дэмаграфічнага, вытворчага, навуковага, інавацыйнага патэнцыялаў Беларусі і іх геаграфічных асаблівасцяў.

Вучэбная дысцыпліна «Фізічная, эканамічная і сацыяльная геаграфія Беларусі» лагічна звязана з іншымі вучэбнымі дысцыплінамі вучэбнага плана спецыяльнасці 1-02 04 02 Біялогія і геаграфія. Яна грунтуецца на ведах, атрыманых студэнтамі пры вывучэнні такіх дысцыплін, як «Геаграфія сусветнай гаспадаркі і насельніцтва», «Фізічная геаграфія мацерыкоў і акіянаў». Для вывучэння вучэбнай дысцыпліны «Фізічная, эканамічная і сацыяльная геаграфія Беларусі» неабходна таксама наяўнасць у навучэнцаў акадэмічных кампетэнцый па вучэбных дысцыплінах «Агульнае землязнаўства», «Картаграфія з асновамі тапаграфіі», «Геалогія». У сваю чаргу веды, атрыманыя пры вывучэнні вучэбнай дысцыпліны «Фізічная, эканамічная і сацыяльная геаграфія Беларусі», неабходны студэнтам для вывучэння такой вучэбнай дысцыпліны, як «Эканамічная і сацыяльная геаграфія краін свету».

Вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Фізічная, эканамічная і сацыяльная геграфія Беларусі» павінна забяспечыць фарміраванне ў студэнтаў акадэмічных, сацыяльна-асобасных і прафесійных кампетэнцый.

**Студэнт павінен:**

**Патрабаванні да акадэмічных кампетэнцый спецыяліста:**

АК-1. Умець выкарыстоўваць базавыя навукова-тэарэтычныя веды для рашэння тэарэтычных і практычных задач.
АК-2. Валодаць сістэмным і параўнальным аналізам.
АК-3. Валодаць даследчыцкімі навыкамі.
АК-4. Умець працаваць самастойна.
АК-6. Валодаць міждысцыплінарным падыходам пры рашэнні праблем
**Патрабаванні да сацыяльна-асобасных кампетэнцый спецыяліста:**
СЛК-1. Валодаць якасцямі грамадзянскасці.
СЛК-2. Быць здольным да сацыяльнага ўзаемадзеяння.
**Патрабаванні да прафесійных кампетэнцый спецыяліста:**
ПК-1. Эфектыўна рэалізоўваць навучальную дзейнасць.
ПК-11. Фарміраваць базавыя кампаненты культуры асобы выхавальніка.
ПК-13. Эфектыўна рэалізоўваць развіваючую дзейнасць у якасці настаўніка-прадметніка і класнага кіраўніка.
ПК-23. Арганізаваць цэласны педагагічны працэс з улікам сучасных адукацыйных тэхналогій і педагагічных інавацый.

У выніку вывучэння дысцыпліны студэнт павінен:

**ведаць:**
- фізіка-геаграфічныя ўмовы і сучасны стан прыроднага асяроддзя Беларусі;
- асаблівасці тэрытарыяльнага размяшчэння прыродных кампанентаў, прыродных комплексаў і прыродных рэсурсаў у межах Беларусі;
- фактары і ўмовы тэрытарыяльнай арганізацыі гаспадаркі Беларусі;
- месца і ролю Беларусі ў міжнародным падзеле працы;

**умець:**
- ацэньваць прыродна-рэсурсны патэнцыял Беларусі і перспектывы яго выкарыстання;
- аналізаваць тэрытарыяльную структуру гаспадаркі Беларусі;
- ацэньваць эканоміка-геаграфічнае і палітыка-геаграфічнае становішча краіны і яе рэгіёнаў;

**валодаць:**
- паняційна-тэрміналагічным апаратам вучэбнай дысцыпліны;
- навыкамі і прыёмамі абагульнення і аналізу разрозненага фактычнага матэрыялу.

Структурыраванне зместу вучэбнай дысцыпліны ажыццяўляецца праз вылучэнне ў ім узбуйненых дыдактычных адзінак – раздзелаў, якія адпавядаюць важным блокам пытанняў, што адносяцца да фізічнай і сацыяльна-эканамічнай геаграфіі Беларусі.

Усяго на вывучэнне дысцыпліны адводзіцца 336 гадзін, з іх аўдыторных гадзін – 190. Прыкладнае размеркаванне аўдыторных гадзін па відах заняткаў: 100 гадзін – лекцыі, 52 гадзіны – практычныя заняткі, 4 гадзіны – семінарскія заняткі, 34 гадзіны – лабараторныя заняткі.

Размеркаванне аўдыдорных гадзін па семестрах на дзённай форме атрымання адукацыі:

у 7 семестры 12 лекцыйных гадзін, 8 гадзін лабараторных заняткаў, 10 гадзін практычных заняткаў, 16 гадзін самастойнай работы студэнтаў;

у 8 семестры 88 лекцыйных гадзін, 26 гадзін лабараторных заняткаў, 42 гадзіны практычных заняткаў, 4 гадзіны семінарскіх заняткаў, 94 гадзіны самастойнай работы студэнтаў.

Бягучая атэстацыя на дзённай форме атрымання вышэйшай адукацыі праводзіцца ў адпаведнасці з вучэбным планам спецыяльнасці ў форме заліка (7 семестр) і экзамена (8 семестр).

На вывучэнне вучэбнай дысцыпліны на завочнай форме атрымання вышэйшай адукацыі адводзіцца 48 аўдыторных гадзін. Размеркаванне аўдыторных гадзін па відах заняткаў: 24 гадзіны лекцый, 16 гадзін лабараторных заняткаў, 8 гадзін практычных заняткаў.

Размеркаванне аўдыдорных гадзін па семестрах на завочнай форме атрымання адукацыі:

у 8 семестры 12 гадзін лекцый, 8 гадзін лабараторных заняткаў, 4 гадзіны практычных заняткаў;

у 9 семестры 12 гадзін лекцый, 8 гадзін лабараторных заняткаў, 4 гадзіны практычных заняткаў.

Бягучая атэстацыя на завочнай форме атрымання вышэйшай адукацыі праводзіцца ў адпаведнасці з вучэбным планам спецыяльнасці ў форме заліка і экзамена (на 5 курсе).

## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

### Раздзел 1. Фізічная геаграфія Беларусі

**Тэма 1.1. Фізічная геаграфія Беларусі як вучэбная дысцыпліна: мэта і задачы курса. Агульны агляд прыроды Беларусі. Ацэнка фізіка-геаграфічнага становішча.** Фізічная геаграфія Беларусі як навука і вучэбная дысцыпліна, яе сутнасць і структура. Мэта і задачы курса ў фарміраванні геаграфічных ведаў студэнтаў педагагічных спецыяльнасцей, яго месца і роля ў сістэме геаграфічных дысцыплін. Агульны агляд прыроды Беларусі. Геаграфічнае становішча і яго ўплыў на фізіка-геаграфічныя працэсы, што працякаюць у рэспубліцы. Ацэнка фізіка-геаграфічнага становішча.

**Тэма 1.2. Даследаванасць прыродных умоў Беларусі.** Асноўныя этапы вывучэння прыроды Беларусі. Дарэвалюцыйны этап (да 1919 г.): картаграфічнае адлюстраванне тэрыторыі Беларусі – карта ВКЛ Т.Макоўскага-М.Радзівіла, тапаграфічныя здымкі А.Ціло, І.Хадзько, К.І. Тэнера; экспедыцыйнае вывучэнне тэрыторыі Беларусі: Ляпёхін І.І., Севергін В.М., Дакучаеў В.В., Жылінскі І.І., Туткоўскі П.А., Місуна Г.Б. Працы А.Кіркора, А.І. Ваейкава, П.М. Шпілеўскага, П.П. Сямёнава-Цяньшанскага аб прыродзе Беларусі. Даваенны перыяд (1919 – 1941 гг.): стварэнне навуковых школ і навуковых устаноў. Уклад у развіццё навукі і даследаванні прыроды Беларусі Бліадуха М.Ф., Смоліча А.А., Мірчынка Г.Ф., М.М. Цапенка, А.І. Кайгародава, Я.Н. Афанасьева., І.Д. Юркевіча. Важнейшыя накірункі геаграфічных даследаванняў на сучасным этапе. Даследаванні і працы Г.І. Гарэцкага, Н.А. Махнач, Э.А. Ляўкова, А.В. Мацвеева, Б.М. Гурскага, А.Х. Шкляра, В.Ф. Якушка, А.Г. Мядзведзева, В.С. Аношка, В.А. Дзяменцьева, Г.І. Марцынкевіч і інш. Навуковыя школы.

**Тэма 1.3. Тапаніміка Беларусі.** Вызначэнне і прадмет тапанімікі. Геаграфічныя назвы, як элемент анамастыкі. Тапаграфічныя даследаванні беларускіх вучоных: Жучкевіча В.А., Рылюка Г.Я. і інш. Паходжанне тапоніма Белая Русь і этноніма беларусы. Правілы і асаблівасці ўзнікнення тапанімічных класаў: аронімаў, гідронімаў, дрымонімаў, харонімаў, айконімаў Беларусі, заканамернасці іх прасторавага размеркавання. Народная этымалогія тапонімаў. Сучасныя праблемы развіцця тапаніміі Беларусі.

**Тэма 1.4. Тэктанічная будова тэрыторыі Беларусі.** Фарміраванне крышталічнага фундамента ў археі – раннім пратэразоі. Асноўныя геаструктурныя элементы фундамента. Геаструктурныя вобласці. Тэктанічнае раянаванне Беларусі. Буйнейшыя тэктанічныя структуры і этапы іх фарміравання. Стратыграфічныя падраздзяленні крышталічнага фундамента па складу, умовах залягання і паходжанню. Дынамічныя працэсы ў зямной кары, глыбінныя разломы і неатэктанічныя рухі.

**Тэма 1.5. Фарміраванне платформавага чахла.** Тыпы платформавага чахла. Асноўныя этапы фарміравання платформавага чахла. Адклады верхняга пратэразою, палеазою, мезазою, кайназою, іх распаўсюджванне і асаблівасці палеагеаграфічнага развіцця тэрыторыі Беларусі ў розных геалагічных

перыядах. Асаблівасці развіцця тэрыторыі Беларусі ў чацвярцічным перыядзе. Мацерыковыя зледзяненні і міжледавікоўі. Асноўныя генетычныя тыпы чацвярцічных адкладаў, іх склад і распаўсюджванне.

**Тэма 1.6. Развіццё прыроды Беларусі ў галацэне. Засяленне тэрыторыі чалавекам.** Узрост галацэна і яго асноўныя стратыграфічныя падраздзяленні. Кліматычныя варыяцыі і іх уплыў на структуру і фарміраванне лесараслiннага покрыва. Фарміраванне відавога складу жывёльнага свету. Засяленне тэрыторыі чалавекам на працягу палеаліта, мезаліта і неаліта, асноўныя стаянкі чалавека. Рассяленне усходне-славянскіх племянных саюзаў па тэрыторыі Беларусі.

**Тэма 1.7. Карысныя выкапні.** Асаблівасці размяшчэння карысных выкапняў і іх сувязь з тэктанічнымі структурамі і геалагічнымі адкладамі. Класіфікацыя карысных выкапняў. Састаў, умовы залягання, утварэння і магчымасці выкарыстання. Гаручыя карысныя выкапні. Металічныя карысныя выкапні. Неметалічныя карысныя выкапні. Вадкія карысныя выкапні. Спосабы распрацоўкі, пошукаў і здабычы карысных выкапняў.

**Тэма 1.8. Рэльеф тэрыторыі Беларусі.** Агульныя рысы будовы паверхні Беларусі. Галоўныя фактары і ўмовы ўтварэння рэльефу. Суадносіны морфаструктуры і морфаскульптуры. Класіфікацыя рэльефу Беларусі. Асноўныя генетычныя тыпы рэльефу: ледавіковы, водна-ледавіковы, азёрна-ледавіковы, алювіяльны, азёрна-алювіяльны, флювіяльны, суфазійна-карставы, эолавы, азёрна-балотны, схілавы, гравітацыйны, тэхнагенны. Геамарфалагічнае раянаванне тэрыторыі Беларусі. Рэльеф вобласці Беларускага Паазер'я, Цэнтральнабеларускіх краявых ледавіковых узвышшаў і град (Заходне і Ўсходне-Беларуская падвобласці), раўнін і нізін Перадпалесся, нізін Палесся.

**Тэма 1.9. Клімат Беларусі. Кліматычнае раянаванне тэрыторыі.** Агульныя рысы клімату Беларусі. Працэсы і фактары кліматаўтварэння. Сумарная радыяцыя і радыяцыйны баланс. Атмасферны ціск. Цыркуляцыя паветраных мас. Цеплавы рэжым Беларусі. Тэмпература паветра і яе тэрытарыяльнае размеркаванне па сезонах года. Водны рэжым Беларусі. Атмасферныя ападкі, іх размеркаванне па тэрыторыі і сезонах года. Кліматычныя рэсурсы. Агракліматычнае раянаванне.

**Тэма 1.10. Характарыстыка сезонаў года.** Каляндарныя і феналагічныя поры года, іх пачатак і працягласць, кліматычныя асаблівасці, асноўныя феналагічныя прыкметы.

**Тэма 1.11. Гідраграфічная сетка Беларусі: рэкі, каналы і водныя сістэмы.** Рачная сетка і сцёк. Паверхневы і падземны сцёк. Водападзелы і галоўныя басейны. Працягласць рэк і гушчыня рачной сеткі. Рэжым рэк па сезонах года. Тыпы жыўлення, лядовы рэжым. Гідралагічнае раянаванне. Гідраграфічная характарыстыка сістэм Дняпра, Заходняй Дзвіны, Нёмана, Прыпяці, Віліі, Заходняга Буга, Ловаці. Параўнальная характарыстыка рэк сістэм Дняпра і Нёмана. Каналы і водныя сістэмы, іх выкарыстанне.

**Тэма 1.12. Азёры, вадасховішчы і сажалкі.** Азёрнасць тэрыторыі. Размяшчэнне і марфаметрыя азёр. Тыпы азёрных катлавін. Гідралагічны і гідрахімічны рэжым азёр. Ацэнка біялагічных рэсурсаў азёр. Генетычная класіфікацыя азёр. Характарыстыка іх асноўных тыпаў. Вадасховішчы і сажалкі, іх тэрытарыяльнае распаўсюджванне і праблемы выкарыстання.

**Тэма 1.13. Глебавае покрыва тэрыторыі Беларусі.** Фактары і працэсы глебаўтварэння на тэрыторыі Беларусі. Глебаўтваральныя пароды, іх генэзіс і грануламетрычны склад. Асноўныя тыпы і падтыпы глебаў, іх распаўсюджванне. Структура глебавага покрыва. Глебава-геаграфічнае раянаванне.

**Тэма 1.14. Зямельныя рэсурсы. Меліярацыя і яе наступствы.** Зямельны фонд, яго структура, дынаміка. Зямельныя рэсурсы, іх выкарыстанне. Дэградацыя зямель. Эрозія глебаў і барацьба з ёй. Меліярацыя, яе віды. Комплексная меліярацыя, яе наступствы. Маніторынг зямель.

**Тэма 1.15. Расліннае покрыва.** Сучасны склад флоры. Тыпы расліннасці Беларусі (занальная, інтразанальная, азанальная). Геабатанічнае раянаванне тэрыторыі. Лясны тып расліннасці. Лясістасць тэрыторыі Беларусі. Лугавы тып расліннасці. Класы лугоў: поймавыя і пазапоймавыя. Тыпы лугоў: поймавыя высокага, сярэдняга і нізкага узроўняў, сухадольныя, нізінныя. Балотная расліннасць. Асноўныя тыпы і падтыпы балот: вярховыя, пераходныя, нізінныя; лясныя, леса-тапяныя і тапяныя. Хмызняковая расліннасць. Ксерафітныя, мезафітныя, гігра- і гідрафітныя хмызнякі. Водная расліннасць.

**Тэма 1.16. Жывёльны свет.** Сучасны склад фаўны. Фаўністычныя комплексы. Жывёльны свет лясоў, вадаёмаў і ўзбярэжжаў, балот і заліўных лугоў, палёў і лугоў, пасяленняў чалавека. Гаспадарчае значэнне. Акліматызаваныя віды. Прамысловыя жывёлы. Зоагеаграфічнае раянаванне Беларусі.

**Тэма 1.17. Прыродаахоўныя тэрыторыі Беларусі.** Тыпы прыродаахоўных тэрыторый Беларусі. Прыродныя нацыянальныя паркі і запаведнікі: Белавежская пушча, Браслаўскі, Нарачанскі, Прыпяцкі, Бярэзінскі, Палескі. Заказнікі і помнікі прыроды рэспубліканскага і мясцовага значэння. Чырвоная кніга Беларусі.

**Тэма 1.18. Ландшафты Беларусі і ландшафтнае раянаванне.** Класіфікацыя ландшафтаў Беларусі. Клас, тып, падтыпы, роды, падроды, віды ландшафтаў. Асаблівасці размяшчэння і характарыстыка родаў ландшафтаў. Занальныя і правінцыяльныя асаблівасці ландшафтаў. Ландшафтнае раянаванне. Прасторавая структура сучасных прыродна-антрапагенных ландшафтаў Беларусі.

**Тэма 1.19. Фізіка-геаграфічнае раянаванне тэрыторыі Беларусі. Паазерская правінцыя, яе комплексная характарыстыка.** Агульныя прынцыпы фізіка-геаграфічнага раянавання ў Беларусі. Фізіка-геаграфічнае раянаванне па В.А. Дзяменцьеву (1960 г.). Фізіка-геаграфічнае раянаванне ў адзінай Еўрапейскай дзесятковай сістэме раянавання. Прыродныя комплексы

ў межах Беларусі. Фізіка-геаграфічныя падзоны, правінцыі, акругі і раёны. Паазерская правінцыя, яе геаграфічнае становішча і межы. Агульная характарыстыка прыродных умоў і рэсурсаў. Уплыў Паазерскага ледавіка на фарміраванне паверхні. Ландшафтная структура.

**Тэма 1.20. Заходне-Беларуская і Усходне-Беларуская правінцыі, іх комплексная характарыстыка.** Геаграфічнае становішча і межы Заходне-Беларускай правінцыі. Прыродныя ўмовы і рэсурсы. Шырокае распаўсюджанне ўзвышшаў і іх уплыў на геаграфічныя працэсы. Ландшафтная структура правінцыі. Геаграфічнае становішча і межы Усходне-Беларускай правінцыі. Прыродныя ўмовы і рэсурсы. Распаўсюджданне лёсаў. Ландшафтная структура правінцыі.

**Тэма 1.21. Правінцыі Перадпалесся і Палесся, іх комплексная характарыстыка.** Геаграфічнае становішча і межы Перадпалескай правінцыі. Прыродныя ўмовы і рэсурсы. Пераходны характар прыродных комплексаў. Ландшафтная структура правінцыі. Геаграфічнае становішча і межы Палескай правінцыі. Прыродныя ўмовы і рэсурсы. Своеасаблівасць прыродных комплексаў Палесся. Ландшафтная структура правінцыі.

**Тэма 1.22. Сучасныя геаэкалагічныя праблемы Беларусі і накірункі іх аптымізацыі.** Геаэкалагічная сітуацыя Беларусі: фарміраванне, змяненне, рэгіянальныя асаблівасці. Сучасныя геаэкалагічныя праблемы выкарыстання зямельных, кліматычных, водных і біялагічных рэсурсаў рэспублікі. Геаэкалагічныя аспекты здабычы карысных выкапняў. Антрапагенная трансфармацыя ландшафтаў Беларусі. Праблемы радыяактыўнага забруджвання прыроднага асяроддзя Беларусі. Асноўныя шляхі вырашэння геаэкалагічных праблем краіны. Геаэкалагічныя аспекты Нацыянальнай стратэгіі ўстойлівага развіцця.

## Раздзел 2. Эканамічная і сацыяльная геаграфія Беларусі

**Тэма 2.1. Эканамічная і сацыяльная геаграфія Беларусі як вучэбная дысцыпліна: мэта, задачы і месца ў сістэме геаграфічных ведаў.** Эканамічная і сацыяльная геаграфія Беларусі як навука і вучэбная дысцыпліна. Сутнасць і структура сацыяльна-эканамічнай геаграфіі. Мэта і задачы курса ў фарміраванні геаграфічных ведаў студэнтаў педагагічных спецыяльнасцей, яго месца і роля ў сістэме геаграфічных дысцыплін. Эканоміка-геаграфічнае вывучэнне Беларусі. Накірункі і задачы сучасных сацыяльна-эканоміка-геаграфічных даследаванняў. Крыніцы інфармацыі па сацыяльна- эканамічнай геаграфіі Беларусі.

**Тэма 2.2. Рэспубліка Беларусь у СНД, еўрапейскім і сусветным супольніцтве.** Рэспубліка Беларусь – новая незалежная дзяржава з пераходнай эканомікай. Утварэнне Беларусі і фарміраванне яе тэрыторыі. Кароткі гістарычны нарыс беларускай дзяржаўнасці і шлях да ўтварэння суверэннай дзяржавы. Дзяржаўнае ўладкаванне. Сучасныя граніцы. Роля і месца Беларусі ў СНД, еўрапейскім і сусветным супольніцтве па плошчы, колькасці насельніцтве, валавым унутраным прадукце, прымысловай і сельска-гаспадарчай вытворчасці і інш. Удзел у міжнародных арганізацыях.

**Тэма 2.3. Асаблівасці і тэндэнцыі сучаснага сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны.** Сутнасць і этапы пераходнага перыяду. Асаблівасці развіцця эканомікі краіны ва ўмовах рыначных адносін. Ацэнка стартавых умоў і сучаснага ўзроўню сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі. Дынаміка асноўных макраэканамічных паказчыкаў: валавога ўнутранага прадукту, узроўню інфляцыі, інвестыцыйнай актыўнасці, плацёжнага балансу, рэальных даходаў насельніцтва і інш. Новыя формы гаспадарання і новыя тыпы прадпрыемстваў. Паглыбленне сувязяў паміж краінамі. Нацыянальная стратэгія ўстойлівага развіцця.

**Тэма 2.4. Эканоміка-геаграфічнае і геапалітычнае становішча Беларусі.** Паняцце аб эканоміка-геаграфічным становішчы (ЭГС) і геапалітычным становішчы (ГПС). Дынамізм, гістарычная зменлівасць і сучасная ацэнка ЭГС і ГПС Беларусі. Асноўныя падыходы да ацэнкі ЭГС і ГПС. Транзітнасць, суседства і блізкасць да мораў як важнейшыя станоўчыя складальнікі ЭГС краіны. Асаблівасці ЭГС асобных рэгіёнаў і прамысловых цэнтраў у кантэксце ўстойлівага іх развіцця і тэрытарыяльнай арганізацыі (жыцця) краіны. ГПС Беларусі і яго асаблівасці.

**Тэма 2.5. Прыродна-рэсурсны патэнцыял Беларусі.** Паняцце аб прыродна-рэсурсным патэнцыяле і яго склад. Прыродныя ўмовы і іх ацэнка для жыцця людзей і гаспадарчай дзейнасці. Прыродныя рэсурсы: геаграфічныя асаблівасці размеркавання і выкарыстання асобных відаў прыродных рэсурсаў (зямельныя, лясныя, водныя, мінеральна-сыравінныя, рэкрэацыйныя, аграрна-кліматычныя). Рацыянальнае прырода-карыстанне як важнейшы накірунак устойлівага развіцця краіны і яе рэгіёнаў.

**Тэма 2.6. Сацыяльна-дэмаграфічны патэнцыял Беларусі.** Паняцце аб сацыяльна-дэмаграфічным патэнцыяле (СДП). Ацэнка сучаснай дэмаграфічнай сітуацыі краіны. Дэмаграфічныя пагрозы і іх уздзеянне на ўстойлівае развіццё. Паняцце аб працоўным патэнцыяле. Колькасны і якасны яго бакі. Дынаміка працоўных рэсурсаў і занятасці насельніцтва. Беспрацоўе і яго геаграфія. Асаблівасці рассялення насельніцтва краіны і кірункі яго ўдасканалення. Узровень і якасць жыцця насельніцтва і іх рэгіянальныя асаблівасці. Стан і геаграфія сацыяльнай інфраструктуры як адзін з важнейшых індыкатараў узроўню і якасці жыцця насельніцтва. Кірункі павышэння ўзроўню і якасці жыцця жыхароў краіны.

**Тэма 2.7. Вытворчы, навукова-тэхнічны і інавацыйны патэнцыялы Беларусі.** Паняцце аб вытворчым, навукова-тэхнічным і інавацыйным патэнцыялах і іх уздзеянне на ўстойлівасць сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны і асобных яе рэгіёнаў. Паказчыкі іх вымярэння. Асаблівасці размяшчэння вытворчага, навукова-тэхнічнага і інавацыйнага патэнцыялаў. Нацыянальная інавацыйная сістэма і Дзяржаўная праграма інавацыйнага развіцця Рэспублікі Беларусь на 2011-2015 гг. як асноўнае яе звяно.

**Тэма 2.8. Гаспадарчая асвоенасць тэрыторыі Беларусі.** Умовы асваення тэрыторыі. Віды асваення тэрыторыі: прамысловае, сельскагаспадарчае, транспартнае, рэкрэацыйнае і інш. Паказчыкі асвоенасці

тэрыторыі. Інтэгральны паказчык асвоенасці. Асаблівасці ацэнкі гаспадарчай асвоенасці тэрыторый рознага ўзроўню (краіны, адміністрацыйных абласцей і раёнаў). Узровень гаспадарчай асвоенасці асобных рэгіёнаў і іх параўнальная ацэнка. Асвоенасць тэрыторыі як вынік і фактар тэрытарыяльнай арганізацыі гаспадаркі і насельніцтва.

**Тэма 2.9. Структура эканомікі па відах эканамічнай дзейнасці і тэрытарыяльная структура гаспадаркі Беларусі.** Агульнадзяржаўны класіфікатар відаў эканамічнай дзейнасці і яго асаблівасці. Тэндэнцыі змяненняў структуры эканомікі краіны і яе рэгіёнаў па відах эканамічнай дзейнасці. Міжгаспадарчыя комплексы як спалучэнне розных відаў эканамічнай дзейнасці. Тэрытарыяльная структура эканомікі і фактары, якія яе абумоўліваюць. Валавы рэгіянальны прадукт. Структура прамысловасці і яе асаблівасці на рэгіянальным узроўні. Узровень тэрытарыяльнай канцэнтрацыі прамысловасці. Буйнейшыя гаспадарчыя цэнтры, вузлы, восі эканамічнага развіцця краіны. Канцэптуальныя палажэнні рэгіянальнага развіцця Беларусі да 2015 г.

**Тэма 2.10. Паліўна-энергетычны комплекс (ПЭК):** склад, асаблівасці сучаснага развіцця і размяшчэння. Склад, структура ПЭК і яго роля ў эканоміцы. Здабыча паліўна-энергетычных карысных выкапняў і яе геаграфічныя асаблівасці. Вытворчасць нафтапрадуктаў. Нафта- і газазабеспячэнне. Структура паліўнага балансу краіны. Электраэнергетыка і яе асаблівасці. Вытворчасць і размеркаванне электраэнергіі і газу. Тыпы электрастанцый і іх геаграфія. Энергабаланс краіны. Праблемы і перспектывы развіцця комплекса. Стратэгія развіцця энергетычнага патэнцыялу краіны.

**Тэма 2.11. Металурга-машынабудаўнічы комплекс (ММК):** склад, асаблівасці сучаснага развіцця і размяшчэння. Склад, структура ММК і яго роля ў эканоміцы краіны. Металургічная вытворчасць і вытворчасць гатовых металічных вырабаў: асаблівасці развіцця і размяшчэння. Буйнейшыя цэнтры. Асаблівасці развіцця і размяшчэння вытворчасці машын, транспартных сродкаў, станкоў, абсталявання і бытавых прыбораў. Буйнейшыя цэнтры. Тэрытарыяльныя дыспрапорцыі ў развіцці ММК. Неабходнасць удасканалення структуры ММК.

**Тэма 2.12. Хімічны комплекс:** склад, асаблівасці сучаснага развіцця і размяшчэння. Склад, структура і роля комплекса ў эканоміцы краіны. Хімічная вытворчасць і яе склад. Перадумовы фарміравання комплекса ў Беларусі. Здабыча мінеральнай сыравіны для хімічнай прамысловасці і вытворчасці ўгнаенняў. Асаблівасці сучаснага развіцця і размяшчэння хімічнай вытворчасці: угнаенняў, пластмас, штучных і сінтэтычных валокнаў, сінтэтычнага каўчука, фарбаў і лакаў, мыла, мыючых, парфумных і касметычных сродкаў, фармацэўтычнай прадукцыі і інш. Праблемы і перспектывы развіцця і размяшчэння комплекса.

**Тэма 2.13. Лесапрамысловы комплекс:** склад, асаблівасці сучаснага развіцця і размяшчэння. Склад, структура і роля комплекса ў эканоміцы краіны. Лясная гаспадарка як база развіцця комплекса. Асаблівасці развіцця і

размяшчэння лясной гаспадаркі, дрэваапрацоўчай і цэлюлозна-папяровай вытворчасці, паліграфічнай і выдавецкай дзейнасці. Вытворчасць мэблі як вядучае звяно комплекса. Геаграфія збору дзікарослых і недраўняных лесапрадуктаў і іх перапрацоўкі. Праблемы і перспектывы развіцця комплекса.

**Тэма 2.14. Аграрна-прамысловы комплекс:** склад, асаблівасці сучаснага развіцця і размяшчэння. Склад, структура і роля комплекса ў эканоміцы краіны, неабходнасць яго рэфармавання. Зямельныя і агракліматычныя рэсурсы, іх ацэнка. Сельскагаспадарчыя ўгоддзі: структура і размяшчэнне. Эканоміка-геаграфічная характарыстыка важнейшых частак комплекса – сельскай гаспадаркі і вытворчасці харчовых прадуктаў. Параўнальная эфектыўнасць сельскагаспадарчай вытворчасці на ўзроўні адміністрацыйных абласцей і раёнаў. Зоны спецыялізацыі сельскай гаспадаркі. Буйнейшыя цэнтры вытворчасці харчовых тавараў. Геаграфія прадпрыемстваў, якія забяспечваюць комплекс сродкамі вытворчасці (трактарамі, машынамі і абсталяваннем, хімічнымі сродкамі абароны раслін і інш.). Праблемы і перспектывы развіцця і размяшчэння комплекса.

**Тэма 2.15. Будаўніча-прамысловы комплекс:** склад, асаблівасці сучаснага развіцця і размяшчэння. Склад, структура і роля комплекса ў эканоміцы краіны. Перадумовы яго развіцця. Здабыча сыравіны для будаўніцтва і вытворчасці неметалічных мінеральных прадуктаў (будаўнічых матэрыялаў). Асаблівасці сучаснага развіцця і размяшчэння вядучых звёнаў комплекса – будаўніцтва і вытворчасці будаўнічых матэрыялаў. Геаграфія вытворчасці пластмасавых вырабаў, якія выкарыстоўваюцца ў будаўніцтве. Забяспечанасць краіны і яе рэгіёнаў айчыннымі будаўнічымі матэрыяламі. Праблемы і перспектывы развіцця комплекса. Важнейшыя аб'екты новага будаўніцтва.

**Тэма 2.16. Комплекс па вытворчасці спажывецкіх тавараў:** склад, асаблівасці сучаснага развіцця і размяшчэння. Склад, структура і роля комплекса ў сацыяльна-эканамічным развіцці краіны. Перадумовы развіцця комплекса. Тэкстыльная, швейная, гарбарная і абутковая вытворчасці як галоўныя часткі комплекса, асаблівасці іх развіцця і размяшчэння. Геаграфія вытворчасці музычных інструментаў, спартыўных тавараў, цацак і інш. Ступень забяспячэння насельніцтва краіны важнейшымі спажывецкімі таварамі айчыннай вытворчасці. Праблемы і перспектывы забяспячэння насельніцтва спажывецкімі таварамі.

**Тэма 2.17. Віды эканамічнай дзейнасці па аказанні паслуг:** склад, асаблівасці сучаснага развіцця і размяшчэння. Структура і роля паслуг у эканоміцы краіны. Фактары тэрытарыяльнай арганізацыі ўстаноў па аказанні паслуг. Гандаль і яго геаграфічныя асаблівасці. Геаграфія ўстаноў па аказанні камунальных, сацыяльных і персанальных паслуг. Транспарт і сувязь у абслугоўванні насельніцтва і вытворчасці. Асаблівасці сучаснага развіцця і размяшчэння фінансавых устаноў і ўстаноў адукацыі і аховы здароўя. Праблемы і перспектывы развіцця і размяшчэння відаў дзейнасці па аказанні паслуг.

**Тэма 2.18. Знешнеэканамічныя сувязі Беларусі.** Віды і значэнне знешнеэканамічных сувязей для развіцця Беларусі. Знешні гандаль як важнейшая форма знешнеэканамічных сувязей краіны. Знешнегандлёвы патэнцыял. Знешнегандлёвы тавараабарот, структура экспарту і імпарту тавараў і паслуг. Геаграфія знешнега гандлю. Рэгіёны Беларусі ў знешнім гандлі. Замежныя інвестыцыі. Свабодныя эканамічныя зоны. Накірункі ўдасканалення знешнеэканамічнай дзейнасці Беларусі.

**Тэма 2.19. Рэгіянальная палітыка і тэрытарыяльныя прапорцыі ў развіцці і размяшчэнні прадукцыйных сіл Беларусі.** Паняцце “рэгіянальная палітыка” , яе мэты і прынцыпы. Рэгіянальныя праблемы і дыспрапорцыі сучаснага развіцця краіны. Важнейшыя накірункі дзяржаўнай рэгіянальнай палітыкі. Канцэптуальныя палажэнні рэгіянальнага развіцця Рэспублікі Беларусь да 2015 г. Праблемныя рэгіёны Беларусі і іх развіццё.

**Тэма 2.20. Эканоміка-геаграфічнае раяніраванне Беларусі.** Мэты і віды эканоміка-геаграфічнага раяніравання. Эканамічнае раяніраванне і адміністрацыйна-тэрытарыяльнае дзяленне. Асаблівасці раяніравання Беларусі ў XX ст. Сацыяльна-эколага-эканамічнае раяніраванне Беларусі. Раяніраванне па ступені ўстойлівасці развіцця рэгіёнаў і праблемнае раяніраванне краіны. Неабходасць удасканалення раяніравання і адміністрацыйна-тэрытарыяльнага дзялення.

**Тэма 2.21. Эканоміка-геаграфічная характарыстыка рэгіёнаў Беларусі.** Значэнне рэгіянальнай сацыяльна-эколага-эканамічнай дыягностыкі для вызначэння тэрытарыяльных прапорцый развіцця Беларусі. Месца і роля ўнутрырэспубліканскіх рэгіёнаў (абласцей і г.Мінска) у нацыянальнай і сусветнай эканоміцы. Адрозненні ў перадумовах сацыяльна-эканамічнага развіцця ўнутрырэспубліканскіх рэгіёнаў. Асаблівасці структуры гаспадаркі рэгіёнаў. Асноўныя сацыяльна-эканамічныя паказчыкі рэгіёнаў. Інтэгральная ацэнка ўзроўню сацыяльна-эканамічнага развіцця рэгіёнаў краіны. Кароткая эканоміка-геаграфічная характарыстыка абласцей і г.Мінска.

# ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ
## (дзённая форма атрымання вышэйшай адукацыі)

| №№ | Назва раздзела, тэмы, занятка; пералік вывучаемых пытанняў | Колькасць аўдыторных гадзін | | | | | Матэрыяльнае забяспячэнне занятка (наглядныя, метадычныя дапаможнікі і інш.) | Літаратура | Форма кантроля ведаў |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Лабараторныя заняткі | Практычныя заняткі | Семінарскія заняткі | Самастойная работа студэнта | | | |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 |
| | | | | 7 семестр | | | | | |
| **1.** | **Фізічная геаграфія Беларусі** | **12** | **8** | **10** | **-** | **16** | | | |
| **1.1.** | **Фізічная геаграфія Беларусі як вучэбная дысцыпліна: мэта і задачы курса. Агульны агляд прыроды Беларусі. Ацэнка фізіка-геаграфічнага становішча (6 гадзін).** | **2** | **2** | **2** | | | | | |
| | *Фізічная геаграфія Беларусі як вучэбная дысцыпліна: мэта і задачы курса. Агульны агляд прыроды Беларусі. Фізіка-геаграфічнае становішча Беларусі.*<br>1. Фізічная геаграфія Беларусі як навука і вучэбная дысцыпліна, яе сутнасць і структура.<br>2. Прадмет і задачы курса.<br>3. Агульны агляд прыроды Беларусі.<br>4. Геаграфічнае становішча Беларусі. | 2 | | | | | Фізічная карта Беларусі. | [1]<br>[9] | |
| | *Ацэнка фізіка-геаграфічнага становішча Беларусі.*<br>1. Беларусь на карце Еўропы.<br>2. Крайнія кропкі Беларусі, іх вызначэнне. Геаграфічны цэнтр краіны, яго вызначэнне.<br>3. Межы Беларусі, іх працягласць з рознымі краінамі, канфігурацыя і памеры тэрыторыі.<br>4. Фізіка-геаграфічныя ўмовы, якія ўплываюць на развіццё краіны. | | 2 | 2 | | | Атлас Беларусі.<br>Фізічная карта Беларусі. | [1]<br>[8]<br>[17] | Кантрольныя пытанні.<br>Праверка індывідуальных заданняў. |

| | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **1.2.** | **Даследаванасць прыродных умоў Беларусі (8 гадзін).** | **2** | **-** | **2** | **-** | **4** | | | |
| | *Даследаванасць прыродных умоў Беларусі.*<br>1. Асноўныя этапы вывучэння прыроды Беларусі.<br>2. Дарэвалюцыйны этап (да 1919 г.).<br>3. Даваенны перыяд (1919 – 1941 гг.).<br>4. Сучасны этап. | 2 | | | | | Фізічная карта Беларусі. | [1,14] | |
| | *Характарыстыка асноўных этапаў вывучэння прыроды Беларусі.*<br>1. Дарэвалюцыйны этап (да 1919 г.): картаграфічнае адлюстраванне тэрыторыі Беларусі – карта ВКЛ Т.Макоўскага-М.Радзівіла, тапаграфічныя здымкі А.Ціло, І.Хадзько, К.І. Тэнера; экспедыцыйнае вывучэнне тэрыторыі.<br>2. Даваенны перыяд (1919 – 1941 гг.): стварэнне навуковых школ і навуковых устаноў. Уклад у развіццё навукі і даследаванні прыроды Беларусі Бліадуха М.Ф., Смоліча А.А., Мірчынка Г.Ф., М.М. Цапенка, А.І. Кайгародава, Я.Н. Афанасьева., І.Д. Юркевіча.<br>3. Важнейшыя накірункі геаграфічных даследаванняў на сучасным этапе. Даследаванні і працы Г.І. Гарэцкага, Н.А. Махнач, Э.А. Ляўкова, А.В. Мацвеева, Б.М. Гурскага, А.Х. Шкляра, В.Ф. Якушка, А.Г. Мядзведзева, В.С. Аношка, В.А. Дзяменцьева, Г.І. Марцынкевіч і інш. Навуковыя школы. | | | 2 | | 4 | Мультымедыйнае суправаджэнне: фотаздымкі вучоных і даследчыкаў, іх асноўныя працы, першыя карты тэрыторыі Беларусі. Атлас Беларусі. | [1]<br>[14]<br>[17] | Кантрольныя пытанні. Праверка індывідуальных заданняў. Кантрольныя тэсты. |
| **1.3.** | **Тапаніміка Беларусі (6 гадзін).** | **-** | **-** | **2** | **-** | **4** | | | |
| | *Тапаніміка Беларусі.*<br>1. Вызначэнне і прадмет тапанімікі.<br>2. Геаграфічныя назвы, як элемент анамастыкі.<br>3. Тапаграфічныя даследаванні беларускіх вучоных: Жучкевіча В.А., Рылюка Г.Я. і інш.<br>4. Правілы і асаблівасці ўзнікнення тапанімічных класаў: аронімаў, гідронімаў, дрымонімаў, харонімаў, айконімаў Беларусі, заканамернасці іх прасторавага размеркавання.<br>5. Сучасныя праблемы развіцця тапаніміі Беларусі. | | | 2 | | 4 | Фізічная карта Беларусі. Атлас Беларусі. | [1]<br>[2]<br>[6]<br>[14] | Кантрольныя пытанні. Праверка індывідуальных заданняў. |

| | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **1.4.** | **Тэктанічная будова тэрыторыі Беларусі (4 гадзіны).** | 2 | 2 | - | - | - | | | |
| | *Тэктанічная будова тэрыторыі Беларусі.*<br>1. Фарміраванне крышталічнага фундамента ў археі – раннім пратэразоі.<br>2. Тэктанічнае раянаванне Беларусі.<br>3. Буйнейшыя тэктанічныя структуры і этапы іх фарміравання.<br>4. Дынамічныя працэсы ў зямной кары, глубінныя разломы і неатэктанічныя рухі. | 2 | | | | | Тэктанічная карта Беларусі. | [1]<br>[9]<br>[12]<br>[16]<br>[19] | |
| | *Пабудова тэктанічнай картасхемы тэрыторыі Беларусі.*<br>1. Асноўныя геаструктурныя элементы фундамента.<br>2. Геаструктурныя вобласці.<br>3. Стратыграфічныя падраздзяленні крышталічнага фундамента, іх склад, умовы залягання.<br>4. Усталяванне ўзаемасувязі паміж будовай фундамента і магутнасцю платформавага чахла. | | 2 | | | | Тэктанічная карта Беларусі. Атлас Беларусі.<br>Контурная карта Беларусі. | [1]<br>[6]<br>[8]<br>[16]<br>[19] | Кантрольныя пытанні. Праверка індывідуальных заданняў. |
| **1.5.** | **Фарміраванне платформавага чахла (8 гадзін).** | 2 | - | 2 | - | 4 | | | |
| | *Фарміраванне платформавага чахла.*<br>1. Тыпы платформавага чахла.<br>2. Асноўныя этапы фарміравання платформавага чахла.<br>3. Адклады верхняга пратэразою, палеазою, мезазою, кайназою, іх распаўсюджванне і асаблівасці палеагеаграфічнага развіцця тэрыторыі Беларусі ў розных геалагічных перыядах. | 2 | | | | | Геалагічная карта Беларусі. | [1]<br>[6]<br>[13]<br>[20] | |
| | *Фарміраванне платформавага чахла ў антрапагене.*<br>1. Асаблівасці развіцця тэрыторыі Беларусі ў чацвярцічным перыядзе.<br>2. Мацерыковыя зледзяненні і міжледавікоўі.<br>3. Асноўныя генетычныя тыпы чацвярцічных адкладаў, іх склад і распаўсюджванне. | | | 2 | | 4 | Карта чацвярцічных адкладаў Беларусі.<br>Атлас Беларусі.<br>Контурная карта Беларусі. | [1]<br>[6]<br>[9]<br>[13]<br>[17]<br>[20] | Кантрольныя пытанні. Праверка індывідуальных заданняў. |
| **1.6.** | **Развіццё прыроды Беларусі ў галацэне. Засяленне тэрыторыі чалавекам (6 гадзін).** | - | - | 2 | - | 4 | | | |

| | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | *Развіццё прыроды Беларусі ў галацэне. Засяленне тэрыторыі Беларусі чалавекам.*<br>1. Узрост галацэна і яго асноўныя стратыграфічныя падраздзяленні.<br>2. Кліматычныя варыяцыі і іх уплыў на структуру і фарміраванне лесараслiннага покрыва.<br>3. Фарміраванне відавога складу жывёльнага свету.<br>4. Засяленне тэрыторыі чалавекам на працягу палеаліта, мезаліта і неаліта.<br>5. Рассяленне усходне-славянскіх племянных саюзаў па тэрыторыі Беларусі. | | | 2 | | 4 | Атлас Беларусі.<br>Фізічная карта Беларусі.<br>Контурная карта Беларусі. | [1]<br>[9]<br>[13]<br>[17]<br>[20]] | Кантрольныя пытанні.<br>Праверка індывідуальных заданняў. |
| **1.7.** | **Карысныя выкапні (4 гадзіны).** | **2** | **2** | - | - | - | | | |
| | *Карысныя выкапні.*<br>1. Асаблівасці размяшчэння карысных выкапняў і іх сувязь з тэктанічнымі структурамі і геалагічнымі адкладамі.<br>2. Класіфікацыя карысных выкапняў.<br>3. Састаў, умовы залягання, утварэння і магчымасці выкарыстання.<br>4. Спосабы распрацоўкі, пошукаў і здабычы карысных выкапняў. | 2 | | | | | Карта карысных выкапняў Беларусі.<br>Тэктанічная карта Беларусі. | [1]<br>[6]<br>[13]<br>[17]<br>[20] | |
| | *Пабудова карты размеркавання карысных выкапняў на тэрыторыі Беларусі.*<br>1. Гаручыя карысныя выкапні.<br>2. Металічныя карысныя выкапні.<br>3. Неметалічныя карысныя выкапні.<br>4. Вадкія карысныя выкапні. | | 2 | | | | Карта карысных выкапняў Беларусі.<br>Тэктанічная карта Беларусі.<br>Контурная карта Беларусі. | [1]<br>[2]<br>[6]<br>[9]<br>[15]<br>[17]<br>[20] | Кантрольныя пытанні.<br>Праверка індывідуальных заданняў. Кантрольныя тэсты. |
| **1.8.** | **Рэльеф тэрыторыі Беларусі (4 гадзіны).** | **2** | **2** | - | - | - | | | |
| | *Рэльеф тэрыторыі Беларусі.*<br>1. Агульныя рысы будовы паверхні Беларусі.<br>2. Галоўныя фактары і ўмовы ўтварэння рэльефу.<br>3. Суадносіны морфаструктуры і морфаскульптуры.<br>4. Геамарфалагічнае раянаванне (паводле Л.М. Вазнячука і А.В. Мацвеева).<br>5. Рэльеф вобласці Беларускага Паазер'я, Цэнтральнабеларускіх краявых ледавіковых узвышшаў і град (Заходне і Ўсходне-Беларуская | 2 | | | | | Фізічная карта Беларусі. | [1]<br>[2]<br>[9]<br>[17] | |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | падвобласці), раўнін і нізін Перадпалесся, нізін Палесся. | | | | | | | |
| | *Класіфікацыя рэльефу Беларусі. Вывучэнне геаграфічнай наменклатуры (рэльеф).*<br>1. Класіфікацыя рэльефу Беларусі.<br>2. Асноўныя генетычныя тыпы рэльефу: ледавіковы, водна-ледавіковы, азёрна-ледавіковы, алювіяльны, азёрна-алювіяльны, флювіяльны, суфазійна-карставы, эолавы, азёрна-балотны, схілавы, гравітацыйны, тэхнагенны.<br>3. Складанне карты рэльефу паверхні тэрыторыі Беларусі. | | 2 | | | Атлас Беларусі. Фізічная карта Беларусі. Контурная карта Беларусі. | [1]<br>[2]<br>[9]<br>[17] | Праверка індывідуальных заданняў і геаграфічнай наменклатуры. **Кантрольная работа па рэйтынгавай сістэме № 1. Тэмы 1.1-1.8** |
| | **Усяго за семестр** | **12** | **8** | **10** | **-** | **16** | | **Залік** |
| | **8 семестр** | | | | | | | |
| | **Фізічная геаграфія Беларусі** | **36** | **12** | **16** | **-** | **36** | | |
| **1.9.** | **Клімат Беларусі. Кліматычнае раянаванне тэрыторыі (6 гадзін).** | **4** | **2** | **-** | **-** | **-** | | |
| | *Клімат Беларусі.*<br>1. Агульныя рысы клімату Беларусі.<br>2. Працэсы і фактары кліматаўтварэння.<br>3. Сумарная радыяцыя і радыяцыйны баланс.<br>4. Атмасферны ціск. Цыркуляцыя паветраных мас. | 2 | | | | - | Кліматычная карта Беларусі. Фізічная карта Беларусі. | [1]<br>[11]<br>[12]<br>[17] | |
| | *Клімат Беларусі.*<br>1. Цеплавы рэжым Беларусі. Тэмпература паветра і яе тэрытарыяльнае размеркаванне па сезонах года.<br>2. Водны рэжым Беларусі. Атмасферныя ападкі, іх размеркаванне па тэрыторыі і сезонах года.<br>3. Кліматычныя рэсурсы. Агракліматычнае раянаванне. | 2 | | | | | Кліматычная карта Беларусі. Фізічная карта Беларусі. | [1]<br>[2]<br>[8]<br>[11]<br>[12]<br>[17]<br>[20] | |
| | *Вызначэнне хода асноўных кліматычных элементаў. Кліматычнае раянаванне тэрыторыі.*<br>1. Аналіз кліматычных карт.<br>2. Пабудова і іаналіз кліматаграм дзвюх метэастанцый, размешчаных у розных частках РБ. | | 2 | | | | Схема агракліматычнага раянавання Беларусі. Кліматычная карта Беларусі. Атлас Беларусі. Фізічная | [1]<br>[6]<br>[11]<br>[12]<br>[17] | Кантрольныя пытанні. Праверка індывідуальных заданняў схемы агракліматычнага раянавання тэрыторыі |

| | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 3. Пабудова схемы агракліматычнага раянавання, яе аналіз.<br>4. Вызначэнне асноўных кліматычных паказчыкаў для агракліматычных раёнаў. | | | | | | карта Беларусі. Контурная карта Беларусі. | | Беларусі. Кантрольныя тэсты. |
| **1.10.** | **Характарыстыка сезонаў года (8 гадзін).** | **2** | **-** | **2** | **-** | **4** | | | |
| | *Характарыстыка сезонаў года.*<br>1. Каляндарныя і феналагічныя поры года.<br>2. Пачатак, кліматычныя асаблівасці і працягласць феналагічных пор года ў Беларусі. | 2 | | | | | Фізічная карта Беларусі. Прэзентацыя “Поры года Беларусі” | [2]<br>[8]<br>[9]<br>[17]<br>[20] | |
| | *Феналогічныя прыкметы пор года ў Беларусі.*<br>1. Асноўныя феналагічныя прыкметы лета, восені, зімы і вясны ў Беларусі.<br>2. Народны каляндар.<br>3. Неспрыяльныя кліматычныя ўмовы і з’явы надвор’я ў Беларусі. | | | 2 | | 4 | Атлас Беларусі. Фізічная карта Беларусі. | [1]<br>[9]<br>[17]<br>[20] | Кантрольныя пытанні. Складанне план-канспекту. Індывідуальнае апытанне. |
| **1.11.** | **Гідраграфічная сетка Беларусі: рэкі, каналы і водныя сістэмы (4 гадзіны).** | **2** | **2** | **-** | **-** | **-** | | | |
| | *Гідраграфічная сетка Беларусі.*<br>1. Рачная сетка і сцёк. Паверхневы і падземны сцёк.<br>2. Водападзелы і галоўныя басейны.<br>3. Працягласць рэк і гушчыня рачной сеткі.<br>4. Рэжым рэк па сезонах года. Тыпы жыўлення, лядовы рэжым. | 2 | | | | - | Фізічная карта Беларусі. | [3]<br>[5]<br>[17]<br>[20] | |
| | *Рэкі, каналы, водныя сістэмы, іх характарыстыка.*<br>1. Гідралагічнае раянаванне.<br>2. Гідраграфічная характарыстыка сістэм Дняпра, Заходняй Дзвіны, Нёмана, Прыпяці, Віліі, Заходняга Буга, Ловаці.<br>3. Параўнальная характарыстыка рэк сістэм Дняпра і Нёмана.<br>4. Каналы і водныя сістэмы, іх выкарыстанне. | | 2 | | | | Фізічная карта Беларусі. Атлас Беларусі. Блакітная кніга Беларусі. | [1]<br>[3]<br>[9]<br>[18]<br>[20] | Кантрольныя пытанні. Праверка індывідуальных заданняў і геаграфічнай наменклатуры. |
| **1.12.** | **Азёры, вадасховішчы і сажалкі (4 гадзіны).** | **2** | **2** | **-** | **-** | **-** | | | |
| | *Азёры, вадасховішчы і сажалкі.*<br>1. Азёрнасць тэрыторыі. Размяшчэнне і марфаметрыя азёр.<br>2. Тыпы азёрных катлавін. | 2 | | | | | Фізічная карта Беларусі. | [3]<br>[5]<br>[17]<br>[20] | |

| | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 3. Гідралагічны і гідрахімічны рэжым азёр. | | | | | | | | |
